ПАЛЕСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# Чытаем па-беларуску

*«Любіце кнігу, бо яна —*
*крыніца мудрасці,*
*ведаў і навукі,*
*лекі для душы»*

*Францыск Скарына*

# Якуб Колас



(1882-1956)

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць*




**Колас, Я.** Сымон-музыка : вершы і паэма / Я. Колас. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. - 319 с. : іл.




*Паэма **“Новая зямля”,** напісаная народным паэтам Якубам Коласам – першы беларускі буйны эпічны твор. Гэтая кніга павінна быць у бібліятэцы кожнага, хто лічыць сябе беларусам. Гэта першая нацыянальная паэма, якую справядліва называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства, класічным творам нашай літаратуры, і проста цудоўнай паэзіяй. **Сам аўтар лічыў "Новую зямлю" асноўнай паэмай за ўсю гісторыю сваёй творчасці.***

*Якуб Колас пачаў пісаць кнігу ў 1911 годзе, падчас знаходжання ў трохгадовым зняволенні за ўдзел у рэвалюцыйным руху 1905–1906 гг. Працягам кнігі многія крытыкі лічаць "Сымона Музыку". Мала дзе ў беларускай літаратуры сустрэнеш столькі крылатых выразаў і дасціпных слоўцаў, як у “Новай зямлі”. Яны і сёння, ужытыя да месца, упрыгожаць любую гутарку, нягледзячы на тое, што паэма была створана вельмі даўно і тэматыка ў яе спецыфічная — сялянская. “Новую зямлю”, звычайна, бегла вывучаюць у школе, і потым да яе ніколі не вяртаюцца. А шкада! Пры больш “дарослым” прачытанні знаходзіш новыя фарбы і эмоцыі, многае ўспрымаеш інакш. І немудрагелістая гісторыя сям’і палясоўшчыка Міхала, які марыць аб уласнай зямлі, успрымаецца, як велічная і трагічна-філасофская.*



*(У.М.Казбярук)*

























*Мой родны кут, як ты мне мілы,*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*



# Янка Купала

(1882-1942)

*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына;*
*Паміж сваіх і чужакоў*
*Яна мне ласкай матчынай.*




**Купала, Я.** З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п'есы : літаратурна-мастацкае выданне / Я. Купала ; укл. В. Шніпа ; прадм. В. Максімовіч. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. - 446 с.







*Твор* ***«Раскіданае гняздо»*** *быў напісаны ў выглядзе п'есы ў пяці актах. Драма сям'і Зяблікаў, лёс якіх раскрывае Янка Купала ў сваёй кнізе, была драмай беларускага народа. Падзеі разгортваюцца падчас рэвалюцыі 1905 года.*

*У аснову п'есы пакладзены факты з жыцця сям'і, у якой князь Радзівіл адабраў зямлю і дом. Асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Янка Купала паказаў у творы цяжкі шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай радзімы, зямлі і волі. Сёння п'есу "Раскіданае гняздо" іграюць у мінскіх тэатрах.*


Янка Купала
ПАЎЛІНКА


Заўсёды бяда
бяду вядзе,
але ніколі не
трэба здавацца.


№ 6.
ЖАЛЕЙКА
ЯНКИ КУПАЛЫ


ЯНКА КУПАЛА · ПАЭМЫ


Янка Купала
Молодая БЕЛАРУСЬ


ЯНКА КУПАЛА
СПАДЧЫНА


Янка Купала
КУРГАН


Янка Купала
РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО



(1891-1917)

# Максім Багдановіч

Вечна светлы і вечна дужы,
Вечна юны, як наша зямля.
Мы табой ганарымся — і плачам,
Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.
Нізка голаў схіляю, юнача,
Перад вечным глаголам тваім.

Смела крочу цяпер у пяскі я
Перад светлай заветнай гарой,
Бо як ёсць у народа такія —
Не загіне давеку народ.

У. Караткевіч.
«Багдановічу»




**Багдановіч, М.** Вершы : паэзія / М. Багдановіч. - Мінск : Юнацтва, 1981. - 127 с. : іл.




"Добра быць коласам,
але шчаслівы той,
каму давялося быць васільком.
Бо нашто каласы,
калі няма васількоў?"

















# Кандрат Крапіва



(1896-1991)




*Я ў мастацкім агародзе*
*Толькі марная трава.*
*А якая? Смех, дый годзе:*
*Я — пякучка-крапіва.*
*Я расту вось тут пад плотам*
*І не так даўно ўзышла,*
*А ўжо многім абармотам*
*Рукі-ногі папякла.*

*Хто палез за агуркамі,*
*Хай той носіць пухіры —*
*Мяне голымі рукамі*
*Асцярожна, брат, бяры.*
*Хто сустрэўся быў са мною,*
*Дакрануўся раз ці два,*
*Дык той ведае ўжо, хто я:*
*Я — пякучка-крапіва*

**Крапіва, К.** Выбраныя творы ў двух тамах : у 2-х т. Т.2 / К. Крапіва. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. - 622 с. : 8 л. іл.

*Народны гумар, самаіронія і сарказм надаюць нацыянальную адметнасць беларускай літаратуры. Сярод аўтараў гэтага жанру варта ўзгадаць Кандрата Крапіву, чые творы да гэтага часу чытаюць з задавальненнем. У цэнтры сюжэту – выява ілжэнавуковага Гарлахватскага і яго памагатых.*
*Крапіва раскрывае ў сваім творы не толькі канкрэтна-палітычныя праблемы, але і агульначалавечыя, такія як падхалімства, хабарніцтва, здрада. Пра ўсё гэта і напісаў аўтар.*
*У скарбонцы фільмаў кінастудыі "Беларусьфільм" у 1954 годзе дадалося. У свет выйшла экранізацыя п'есы Кандрата Крапівы* ***"Хто смяецца апошнім".***




















# «Каб сонца засланіць – вушэй аслiных мала»

«Сава,асёл ды сонца»
К. Крапіва 1927г.











# Сяргей Грахоўскі



(1913-2002)

**Айчына**

Твайго цяпла, твайго святла, і хлеба,
І шчырасці на кожнага стае.
Шчаслівы я, што пад высокім небам
Пралеглі сцежкі першыя мае,

Што ты люляла і складала казкі,
Што за руку ў дарогу павяла,
Што дабрату, і клопаты, і ласку,
І шчодрасць, і суровасць нам дала.




Грахоўскі, С. І. Зона маўчання : аповесць / С. І. Грахоўскі. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. - 238 с.




Мая душа
Супраціўлялася,
Бо верыла і тым
жыла,
І не чарсцвела
Не ламалася —
Была такою, як была.
Хоць дзіўна,

Ў чым яна
трымалася,
А паспрабуй
Яе сагні!
Яна ж з маленства
Гартавалася
На чыстым,
Праведным агні.















# Андрэй Макаёнак



(1920-1982)




*«Яркім метэорам уварваўся ў наш тэатр Андрэй Макаёнак. Гэта быў "Чалавек-тэатр". Мы вельмі любілі, калі ён чытаў нам свае п'есы. Ён не проста чытаў, ён гуляў і пражываў жыццё кожнага са сваіх герояў у нас на вачах. Пражываў таленавіта і заразліва. Андрэй Ягоравіч вельмі кахаў людзей і беражліва да іх ставіўся. Кожная прэм'ера яго п'ес была падзеяй, святам для ўсіх нас».*

*З успамінаў акцёраў Купалаўскага тэатра*

*Макаёнак, А. Я. Зацюканы апостал : п'есы / А. Я. Макаёнак. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. - 303 с.*


Андрэй Макаёнак
(1920 - 1982)
АНДРЭЙ МАКАЁНАК
Таблетку пад язык
Андрэй Макаёнак
П'ЕСЫ
Андрэй
Макаёнак
ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА
АНДРЭЙ МАКАЁНАК
П'ЕСЫ
ДОМ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ
А. Макаёнак
ПЕРАД СУСТРЭЧАЙ
ЖЫЦЦЁ ПАТРАБУЕ
П'ЕСЫ
БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ
АНДРЭЙ МАКАЁНАК
ЛЯВОНІХА НА АРБІЦЕ

# Іван Мележ



(1921-1976)

*А на Палессі ўсё нядробна:*
*цяжкая спадчына вякоў,*
*Цяжкія рукі хлебаробаў,*
*цяжкія сны палешукоў*
*Якую трэба мець аддана сць*
*і сэрца сынава, каб так*
*Любіць палескі край туманны*
*і маці бедны андарак.*

*П. П.Панчанка*




**Мележ, І.** Людзі на балоце : раман з "Палескай хронікі" / І. Мележ. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. - 446 с.

*Раман **“Людзі на балоце”** Івана Мележа - адна з вяршыняў беларускай літаратуры, узор пасляваенных твораў. Шмат у чым лірычны раман расказвае пра жыхароў глухой вёскі Курані, якая адрэзана ад знешняга свету непраходнымі палескімі балотамі. Іван Мележ амаль з этнаграфічнай дакладнасцю паказаў побыт беларускага насельніцтва на прыкладзе паўсядзённага жыцця жыхароў вёскі. У рамане паказаны нацыянальныя традыцыі, паданні, гульні з песнямі, калядная варажба палешукоў.*

*Аўтар на прыкладзе галоўных герояў кнігі апісаў лёс і драму жыцця беларускага народа.*

*Людзі на балоце” – гэта адзін з нямногіх беларускіх твораў, якія выйшлі на экраны тэлебачання як шматсерыйны фільм.*







Іван Мележ
(8.02.1921—9.08.1976)

***Я** багата бяды выпадае чалавеку за іншы адзін крок. І як чалавек робіць гэты крок пакорліва, нібы сляпы, – не бачачы ўсяго, што будзе яму з гэтым крокам.*

*Іван Мележ*



















*«Я нарадзіўся і вырас на Палессі. Гэта сапраўды цудоўны край і яшчэ болей цудоўныя яго людзі-палешукі - увайшлі ў маю свядомасць з таго часу, як я стаў помніць сябе…»*



# Васіль Быкаў

(1924-2003)




*Ты не памёр. Вечна жывы.*
*Ісці ў страі салдацкім будзеш.*
*Ніколі, друг мой баявы,*
*Цябе планета не забудзе.*
*Вышэй узнімеш крыж святы.*
*І хай ярчэй заззяе.*
*З такімі воямі, як ты,*
*Радзіма ростані не знае.*

*Пятро Прыходзька*

**Быкаў, В.** Збор твораў у шасці тамах. Т.2. Сотнікаў. Здрада. Яго батальён. Праклятая вышыня / В. Быкаў. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. - 463 с. : 4 л. іл.




*Кнігі, створаныя беларускім празаікам Васілём Быкавым, прынеслі яму сусветную вядомасць і прызнанне мільёнаў чытачоў. Прайшоўшы скрозь пекла Вялікай Айчыннай вайны, праслужыўшы ў пасляваеннай арміі, напісаўшы паўсотні твораў, жорсткіх, шчырых і бязлітасных, Васіль Быкаў да самай сваёй смерці заставаўся "сумленнем" не толькі Беларусі, але і кожнага асобнага чалавека па-за яго нацыянальнай прыналежнасцю.*

*Нездарма **"Альпійская балада"** ў многіх займае цэнтральнае месца на кніжнай паліцы. Імя Васіля Быкава вядома на ўвесь свет.*
*У сваёй кнізе Васіль Быкаў апавядае пра лёс двух ваеннапалонных, якім удалося ўцячы з аўстрыйскага лагера. Уся праўда пра вайну, якую беларускі аўтар расказваў у сваіх кнігах, не проста ўражвала, яна абпальвала. Яго глыбінныя творы аб людзях, якія сутыкнуліся з жахамі вайны, не мае сабе роўных у айчыннай літаратуры.*
*Па матывах аповесці "Альпійская балада" быў зняты фільм з аднайменнай назвай. Экранізаваў кнігу ў 1965 годзе рэжысёр кінастудыі "Беларусьфільм" Барыс Сцяпанаў.*


МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
АЛЬПІЙСКАЯ БАЛАДА
ПАКАХАЙ МЯНЕ, САЛДАЦІК
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
КАР'ЕР
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
ПАЙСЦІ
І НЕ ВЯРНУЦЦА
Васіль Быкаў
Жураўліны крык
МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
СОТНІКАЎ
У ТУМАНЕ
ВАСИЛЬ БЫКОВ
ВОЕННЫЕ ПОВЕСТИ

# Уладзімір Караткевіч



(1930-1984)

*«Дзе мой край?*
*Там, дзе людзі ніколі ня будуць рабамі,*
*Што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме,*
*Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,*
*А мужчыны, як скалы, - ударыш, і зломіцца меч.»*




**Караткевіч, У.** Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць / У. Караткевіч ; маст. М. С. Басалыга. - Мінск : Беларусь, 2008. - 143 с. : іл.

Адзін з самых значных раманаў беларускай літаратуры. Твор, напісаны ў дзвюх частках, прысвечаны падзеям напярэдадні паўстання 1863–1864 гадоў у Беларусі. У першай кнізе ідзе апавяданне аб зараджэнні незадаволенасці, якія выліліся ў раку гневу і барацьбы за незалежнасць Беларусі. Чытаючы раман, поўнасцю апускаешся ў падзеі таго часу і бачыш перад сабой хлапчука Алеся Загорскага і яго сяброў. Галоўны рэвалюцыянер Кастусь Каліноўскі таксама ўзгадваецца на старонках рамана. Кніга распавядае як мяняўся светапогляд беларусаў і якімі ахвярамі будавалі будучыню для краіны.

***Караткевіч, У.*** *Каласы пад сярпом тваім : раман / У. Караткевіч. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. - 814 с.*





ХТО НЕ ПАМЯТАЕ МІНУЛАГА,
ХТО ЗАБЫВАЕ МІНУЛАЕ -
АСУДЖАНЫ ЗНОЎ ПЕРАЖЫЦЬ
ЯГО. БЕЗЛІЧ РАЗОЎ
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
Малюнкі У. Караткевіча
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ
МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
ЧАЗЕНІЯ
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА
ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ
ЖЫЦЦЕ І ЎЗНЯСЕННЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА
МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА



# Іван Шамякін

Калі пясняр такі
ёсць у народа,
То за яго паклон
табе, народ!

Г.Пашкоў




**Шамякін, І.** Збор твораў : раман, аповесці. Т.5 Вазьму твой боль. Пошукі прытулку. Крывінка / І. Шамякін. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. - 447 с.


Чалавек
вялікай душы
і таленту
І.П.Шамякін
1921-2004
Шамякін
Іван Пятровіч
ІВАН ШАМЯКІН
ШЛЮБНАЯ НОЧ
Іван Шамякін.
АТЛАНТЫ І КАРЫЯТЫДЫ
Іван Шамякін
Іван Шамякін
Палеская МАДОННА

# Выкарыстаныя рэсурсы:

https://goo.su/aA6s
https://goo.su/beKT
https://goo.su/Dvh
https://goo.su/bszx
https://goo.su/aYtE
https://goo.su/aVFU



г. Пинск
ул. Пушкина,4
Библиотека
ПолесГУ
Составитель:
библиотекарь
Д. Н. Сакович